***Семяняка Г. Ю., Яноўская Я. Ю.***

**ДЗЯРЭЧЫН – "МАЛЫ ВЕРСАЛЬ"**
**(ГІСТОРЫЯ МЯСТЭЧКА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ)**

***Навуковы кіраўнік канд. гіст . навук Шабельцаў С. В.***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Лёс многіх беларускіх мястэчкаў выклікае шкадаванне. Сёння яны ціхмяна дажываюць свой век. Не збярогшы сведчанняў свае былое велічы, паступова ператвараюцца ў звычайныя вялікія вёскі.

Не выключэннем з гэтага з'яўляецца і лёс беларускай вёсачкі Дзярэчын Гродзенскай вобласці. Гісторыя і славутасці гэтага мястэчка прыцягвалі ўвагу многіх даследчыкаў. І, пагартаўшы беларускія і польскія энцыклапедыі і іншыя гістарычныя выданні, пераконваешся, што Дзярэчын мае сваю векавечную мінуўшчыну.

Калі чалавек пачынае спазнаваць свой край, ягоныя асаблівасці і сувязі з суседзямі, то варта пачаць з гісторыі блізкай да сэрца мясціны, заклаўшы тым самым падмурак наступных ведаў.

**Мэта:** прааналізаваць гісторыю вёскі Дзярэчын у XV-XXстст.

**Задачы:**

1 Разгледзець палітычнае і эканамічнае развіццё вёскі Дзярэчын у XV-XXстст.

2 Ахарактарызаваць Дзярэчын як цэнтр культурнага жыцця за часы ўладання ім князёў Сапегаў.

3 Зрабіць агляд гістарычнай літаратуры, у якой падаюцца звесткі пра Дзярэчын.

**Матэрыял і метады.**

Тэарэтычныя: выкарыстаны метады тэарэтычнай рэканструкцыі (вывучэнне публікацый гістарычных дакументаў, манаграфій, энцыклапедый па тэме даследавання). Гістарычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.**

Калі шукаць на Беларусі месца, амаль цалкам пазбаўленае свайго гістарычнага выгляду—гэта Дзярэчын. З прыгожай і вялікай некалі рэзідэнцыі сёння не засталося нічога. І калі не ведаць праслаўнае мінулае мястэчка, цяжка нават уявіць, як яно выглядала раней. Гісторыя некалі славутага мястэчка адлюстравана ў шматлікай гістарычнай літаратуры, да якой павінна звяртацца сучаснае пакаленне, каб не ператварылася ў нябыт усё тое велічнае, што было раней на нашых землях.

**Вывады:**

1 Праведзена этымалогія назвы вёскі Дзярэчын, прасочваецца гісторыя яго ўладальнікаў.

2 Прааналізавана гісторыя Дзярэчына, рэзідэнцыі Сапегаў, з пункту гледжання эканамічнага і культурнага развіцця мястэчка.

3 Падаецца апісанне архітэктурных помнікаў і іншых культурных каштоўнасцей мястэчка.